## 2024 г. – 85 гадоў з часу заснавання Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі (1939), дзяржаўнай установы культуры



Звесткі аб існаванні грамадскай бібліятэкі ў Кобрыне адносяцца да пачатку XX стагоддзя, аднак невядома, каму яна належала, які быў яе фонд і склад чытачоў. Бібліятэка праіснавала да жніўня 1915 года, калі ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі ў час Першай сусветнай вайны большасць насельніцтва была эвакуіравана ў глыб Расіі.

У час германскай акупацыі і ў першыя гады пад уладай Польшчы аматары чытання карысталіся за адпаведную плату невялікай бібліятэчкай уладальніка кніжнага магазіна Абрамовіча, на складзе якога было шмат рускай літаратуры. Але ў сувязі з тым, што бібліятэка дзейнічала, па сутнасці, на паўлегальным становішчы, у пачатку 1920-х гадоў. яна была закрыта польскай адміністрацыяй.

У 1921 годзе ўзнікла першая польская бібліятэка пры клубе «Адраджэнне», якая абслугоўвала толькі 35 падпісчыкаў. Яе кніжны фонд складаўся з 940 кніг і брашур. Найбольш папулярнай і агульнадаступнай лічылася бібліятэка польскага школьнага таварыства, якая ўзнікла ў 1925 годзе і мела 1370 кніг і 308 чытачоў. Існавала ў горадзе таксама бібліятэка пры яўрэйскім культурна-асветным таварыстве імя Брэнера. У 1928 годзе групай рускіх інтэлігентаў была арганізавана руская бібліятэка з кніжным фондам 750 экзэмпляраў. У 1934 годзе была арганізавана бібліятэка пры павятовым паліцэйскім упраўленні, у якой налічвалася 760 кніг.

Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР у верасні 1939 года прынята рашэнне аб адкрыцці гарадской бібліятэкі. Размясцілася яна ў невялікім драўляным доме з сямі пакояў на вул. Суворава, 14. Раней дом належаў мясцовай памешчыцы Шыраевай. Сюды былі звезены кнігі і абсталяванне з іншых бібліятэк, на адрас бібліятэкі сталі паступаць пасылкі з кнігамі з ўсходніх раёнаў рэспублікі.

Арганізатарам і першым загадчыкам бібліятэкі стаў кобрынскі краязнаўца, гісторык і грамадскі дзеяч, Ганаровы грамадзянін г. Кобрына (1997) Аляксей Міхайлавіч Мартынаў

(1904-1999). Штат установы складаўся з сямі чалавек, сярод якіх не было ніводнага прафесійнага бібліятэкара. Дзякуючы самаадданаму старанню маленькага калектыву вельмі хутка ўдалося зрабіць бібліятэчную апрацоўку літаратуры і ў канцы года прыняць першых чытачоў. Наладжвалася рэгулярнае чытанне лекцый, афармленне кніжных выставак, камплектаванне перасовак для сельскіх хат-чытальняў і інш. Не спынялася папаўненне кніжнага фонду, які да 1941 года налічваў ужо 14 тысяч экзэмпляраў, а колькасць чытачоў да пачатку вайны склала больш за 2000.

За гады Вялікай Айчыннай вайны акупанты разрабавалі кніжны фонд. У перыяд акупацыі, дзякуючы таму, што многія польскія інтэлігенты ўвайшлі ў давер да немцаў, у Кобрыне была адкрыта бібліятэка з літаратурай выключна на польскай мове. Аднак вялікай папулярнасцю яна не карысталася. Загадчыца бібліятэкі - былая настаўніца Я. А. Крэйвіс, якая потым выехала ў Польшчу.

Пасля вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў, ужо 22 ліпеня 1944 года, на нарадзе актыву ў райкаме КП(б)Б А. М. Мартынаву было даручана ў найкарацейшы тэрмін аднавіць работу бібліятэкі. Пад бібліятэку занялі невялікі цагляны асабняк па вул. Савецкай, 10. У памяшканні былой кніжнай крамы было знойдзена шмат разнастайнай літаратуры (частка кніг са штампам бібліятэкі), якую захопнікі не паспелі вывезці з горада. Такім чынам, бібліятэка адразу займела трывалую базу і ў адносна кароткі тэрмін змагла наладзіць нармальную работу. І зноў дзякуючы намаганням А. М. Мартынава бібліятэка адрадзілася і пачала працаваць.

У 1950-я гады бібліятэка стала сапраўдным культурным цэнтрам. Тут праводзіліся чытацкія канферэнцыі, літаратурна-мастацкія вечары да знамянальных і памятных дат, вечары пытанняў і адказаў і інш.

З 1960 года Кобрынскую бібліятэку ўзначальвала Ванда Дамінікаўна Касько (1935-2011), якая працавала на гэтай пасадзе больш за 30 гадоў. З 1963 года па 1980 год бібліятэка знаходзілася ў двухпавярховым памяшканні на плошчы Свабоды, 7, дзе праіснавала да мая 1980 года. У 1978 годзе ў выніку цэнтралізацыі сеткі бібліятэк Кобрынскага раёна бібліятэка стала цэнтральнай для 62 бібліятэк-філіялаў. У цэнтральнай бібліятэцы было тры аддзелы: абслугоўвання (6 работнікаў), апрацоўкі і камплектавання літаратуры (7), методыка-бібліяграфічны (4).

За сваю гісторыю ўстанова чатыры разы мяняла месцазнаходжанне. 28 мая 1980 года бібліятэка размясцілася на першым паверсе жылога дома па вуліцы Жданава, 12 (сёння - Маршала Жукава); займае плошчу ў 720 кв. м, чытальная зала разлічана на 56 месцаў. У 1980-я гады надаецца больш увагі індывідуальнай рабоце з чытачамі. Пры цэнтральнай раённай бібліятэцы была створана літаратурна-паэтычная група «Рытм», члены якой выступалі ў маладзёжных аўдыторыях, на вытворчых участках, у вучылішчах з самай разнастайнай тэматыкай. Дзейнічаў прафесійны клуб краязнаўчага напрамку «Бацькаўшчына», які аб’ядноўваў усіх бібліятэкараў раёна.

З 1995 года бібліятэку ўзначальвала Марыя Васільеўна Іванова. У практыку работы бібліятэкі ўкараняюцца такія формы прапаганды кнігі, як гадзіны і вечары беларускага фальклору, гадзіны карысных парад і цікавых паведамленняў, дні перыядычнага друку, урокі краязнаўства, бібліятэчныя вячоркі. Работнікі бібліятэкі супрацоўнічаюць з мясцовым друкам, радыёвяшчаннем, у прыватнасці, выступаюць па мясцовым радыё з нарысамі пра знакамітых жыхароў раёна ў цыкле перадач «Шануем нашых землякоў».

У 1999 годзе пачаў стварацца электронны каталог. З 2002 года пры бібліятэцы працуе Публічны цэнтр прававой інфармацыі. З 2010 года бібліятэка атрымала безлімітны доступ у сетку Інтэрнэт, кругласутачнае злучэнне з кожнага аўтаматызаванага рабочага месца. Са снежня 2011 года адкрыты сайт бібліятэкі. З 2013 года бібліятэка вядзе абслугоўванне карыстальнікаў у электронным рэжыме, працуе ў аўтаматызаванай інфармацыйнай бібліятэчнай праграме ALIS-WEB. Акрамя традыцыйных бясплатных паслуг, бібліятэка прапануе 40 відаў дадатковых платных паслуг.

Дырэктар Кобрынскай РЦБС з 2016 года – Ларыса Віктараўна Легацюк. Сёння цэнтральная раённая бібліятэка абслугоўвае больш за 8 тысяч чытачоў, мае каля 100 тысяч адзінак бібліятэчнага фонду, як на папяровых, так і на электронных носьбітах.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г.
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І кат.
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Кобринская центральная районная библиотека** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 467.

**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. - Мінск, 2013. - Т. 4. - С. 516.

**З успамінаў** А. М. Мартынава // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 416-417.

**Іванова, М. В**. Бібліятэкі Кобрыншчыны / М. В. Іванова // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. - Мінск, 2002. - С. 414-415.

**Рачковская, Л. И.** К истории Брестской области / Л. И. Рачковская, А. М. Мяснянкина // Нарысы гісторыі бібліятэк Брэсцкай вобласці. – 2 е выд., дап і перараб. – Брэст, 2001. – С. 3-17.

**Юбілейныя** даты ўстаноў культуры і ўстаноў асветы ў сферы культуры. Цэнтральнай раённай бібліятэцы дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (1939) – 85 // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 149-150.

**Чытай,** краіна, пра нас пішуць! : бібліятэка на старонках СМІ : рэкламна-інфармацыйны спіс да 80-годдзя Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; уклад. Святлана Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2019. - 52 с.

**Елізарава, Ж**. Муза і пяро / Жанна Елізарава ; фота: Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2024. — 6 ліпеня (№ 27). — С. 13 : фат.

У Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча, прысвечанная 90-годдзю Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Бакун, Е.** По пути книги к читателю / Елена Бакун ; фото: Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2023. — 9 верасня (№ 58). — С. 7 : фот.

О работе отдела комплектования, обработки и организации единого фонда Кобринской центральной библиотеки.

**Кандрашук, Н. П.** Страсці-мардасці, або... / Наталля Кандрашук // Культура. - 2022. — 29 студзеня (№ 5). — С. 12 : фат.

Самадзейны тэатр-студыя "Піражок" працуе пры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы.

**Кондрашук, Н. П.** Когда поют библиотекари / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2022. — 10 февраля (№ 6). — С. 2 : фот.

Пять лет назад при Кобринской ЦРБ создана вокальная группа "Фантазия", участниками которой являются библиотекари.

**Курачук, С. Д.** Пространство правового просвещения / Светлана Курачук // Кобрынскі веснік. - 2022. — 16 красавіка (№ 28). — С. 12 : фот.

Публичному центру правовой информации Кобринской центральной районной библиотеки — 20 лет.

**Курачук, С.** Библиотека и нотариат: взаимовыгодное сотрудничество / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2021. — 4 февраля (№ 5). — С. 6 : фот.

С 2021 г. на базе правового центра Кобринской центральной библиотеки планируется проведение бесплатных юридических консультаций нотариуса.

**Курачук, С. Д.** Праздник краеведов / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2020. — 2 апреля (№ 14). — С. 4.

Кобринская библиотека приняла участие в I республиканском краеведческом форуме Республики Беларусь.

**Ефціфеева, Н. П**. Старыя паслугі на новы лад / Наталля Ефціфеева // Літаратура і мастацтва. - 2020. — 27 лістапада (№ 45). — С. 3.

Эпідэміялагічнае становішча дыктуе свае правілы ў рабоце Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

**Курачук, С. Д.** Конкурс виртуальных проектов / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2020. — 8 октября (№ 41). — С. 24.

Кобринская центральная районная библиотека — в числе победителей областного конкурса по созданию виртуальных проектов краеведческой тематики.

**Афанасьва, С.** "Радуга созвучий" / Светлана Афанасьева // Заря. - 2019. — 17 августа. — С. 9.

Под таким названием творческий конкурс к своему 80-летию объявила Кобринская центральная районная библиотека.

**Ефтифеева, Н**. В ногу со временем / Наталья Ефтифеева // Кобрин-информ. - 2019. — 19 сентября. — С. 2 : фот.

Кобринской центральной районной библиотеке исполнилось 80 лет.

**Ефціфеева, Н.** Сугучча талентаў / Наталля Ефціфеева // Кобрынскі веснік. - 2019. — 25 верасня. — С. 8 : фот.

Свой 80-гадовы юбілей Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка адзначыла незвычайна.

**Елизарова, Ж**. Храму книги - 80 лет / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2019. – 14 верасня. – С. 9.

Кобринской центральной районной библиотеке -80 лет.

**Ефціфеева, Н.** Знаёмімся з "ПоэтиКо" / Наталля Ефціфеева // Кобрынскі веснік. - 2019. — 4 верасня. — С. 8.

Літаратурны клуб «ПоэтиКо» пачаў працаваць пры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы.

**Курачук, С.** Диплом от министра информации / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2019. — 14 ноября (№ 46). — С. 3 : фот.

Кобринская центральная районная библиотека — в числе победителей республиканского конкурса «Славутыя імёны маёй малой радзімы».

**Тимошук, А**. Не в аптеку, а в библиотеку! / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 2 студзеня. — С. 1.

В информационно-сервисном центре Кобринской ЦБ прошел праздник чествования победителей районного конкурса «Молодой читатель – 2015».

**Аб выніках** XXV Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" : загад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь // Бібліятэчны свет. - 2017. — № 3. — С. 3-4.

Сярод пераможцаў конкурсу – цэнтральная раённая бібліятэка дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці.

**Елизарова, Ж.** Добро пожаловать в храм Книги! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2017. – 13 верасня. – С. 3.

**Курачук, С**. Библиотека XXI века / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2016. — 15 сентября. — С. 5.

Традиционно в Кобринской центральной районной библиотеке проходит Неделя рекламы «Библиотека XXI века», посвящённая Дню библиотек.

**Кириевская, Е.** Чтобы не пропал интерес к чтению / Елена Кириевская // Кобрынскі веснік. - 2015. — 22 ліпеня. — С. 5.

Кобринская центральная библиотека использует новейшие технологии в обслуживании читателей.

**Лепшыя** бібліятэкі // Заря. - 2015. — 10 июля. — С. 2.

Сярод лепшых бібліятэк-удзельнікаў 23 рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка -асяродак нацыянальнай культуры" - Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка.

**Белов, Д. С** читателями и для читателей / Дмитрий Белов ; фото из архива библиотеки // Кобрынскі веснік. - 2014. — 10 верасня. — С. 3.

Кобринская центральная библиотека 15 сентября отметит 75-летие.

**Галавейка, Т**. ...А назаўтра сайт бібліятэкі наведалі 488 чалавек / Таццяна Галавейка // Культура. - 2013.— 27 ліпеня.— С. 3.

Кобрынская цэнтральная бібліятэка правяла акцыю пад адкрытым небам "Кнігі выйшлі пагуляць", прысвечаную Дню горада.

**Сідарук, І.** Тут кніжкі вабяць светлай цішынёй / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2013.— 13 верасня. — С. 2.

Аб рабоце цэнтральнай раённай бібліятэкі - напярэдадні Дня бібліятэк.

**Занько, Н.** Кабрынчане ацанілі буккросінг / Настасся Занько // Кобрынскі веснік. - 2012. - 25 красавіка. - С. 3.

**Інфармкур'ер** : мясцовыя навіны// Кобрынскі веснік. - 2012. - 28 студзеня. - С. 2.

В Кобринской районной библиотеке появился свой сайт.

**Жук, Е.** А в Кобрине - библиовечеринка! / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2011. - 18 мая. - С. 3.

Кобринская центральная библиотека впервые провела ночь в библиотеке.

**Федаровіч, І.** Пашыраючы спектр паслуг / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 16 красавіка. - С. 3.

Сёння Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка аказвае 35 відаў розных паслуг.

**Гром, А.** Культурный центр родного края / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2010. - 15 студзеня. - С. 8.

О роли Кобринской центральной библиотеки в культурном развитии края.

**Гром, А**. Не просто памятная дата : юбілеі / Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2009. - 7 кастрычніка. - С. 5.

Кобрынская цэнтральная бібліятэка адзначыла 70-годдзе.

**Кандрашук, Н.** Цэнтр у цэнтральнай / Наталля Кандрашук // Культура. - 2009. - 7-13 лістапада. - С. 12.

Кобрынскай цэнтральнай бібліятэцы – 70.

**Мельнік, Р.** Бібліятэка мяняе імідж / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2009. - 15 жніўня. - С. 2.

Кобрынская цэнтральная бібліятэка перажывае капітальны рамонт.

**Курига, Е.** Библиотека XXI века / Елена Курига // Кобрин-информ. - 2008. - 19 июня. - С. 6.

О том, что сегодня представляет Кобринская библиотека, рассказала главный библиограф Светлана Курачук.

**Галавейка, Т.** Цэнтр інфармацыі і культуры / Т. Галавейка // Кобрынскі веснік. – 2006. – 13 верасня. – С. 3.

**Хильчук, М.** Объединяет книга / М. Хильчук // Кобрынскі веснік. – 2006. 21 студзеня.

При центральной библиотеке работает клуб «Золотые годы».

**Цвяткова, Л.** Бібліятэка і чытач: мы разам / Л. Цвяткова // Кобрынскі веснік. – 2006. – 23 верасня.

**Аляксееў, У**. Новыя тэхналогіі да юбілею / У. Аляксееў // Настаўніцкая газета. – 2004. – 26 кастрычніка. – С. 1.

Кобрынскай цэнтральнай бібліятэцы – 65.

**Корнелюк, Т.** Компьютер – в помощь читателям / Т. Корнелюк // Вечерний Брест. – 2004. – 24 сентября. – С. 3.

Кобринская библиотека отметила 65-летний юбилей.

**Курачук, С.** Библиотека – читателю: новые возможности / Светлана Курачук // Кобрынскі веснік. – 2004. – 3 студзеня. – С. 3.

**Бойко, Н.** Библиотечный рай / Н. Бойко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 16 красавіка. – С. 3

Кобринская центральная библиотека.

**Бібліятэка** – юбіляр : [да 60-годдзя Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі] / калектыў бібліятэкі // Кобрынскі веснік. - 1999. - 29 верасня.

**Сущук, А.** Юбилейное слово читателя : к 60-летию Кобринской центральной районной библиотеки / А. Сущук // Кобрынскі веснік. - 1999. - 2 кастрычніка.

**Галавейка, Т.** На што здольна бібліятэка / Т. Галавейка // Кобрынскі веснік. – 1996. - 23 сакавіка (№ 23). – С. 2.

**Пятрўская, М.** Наваселле бібліятэкі / Марыя Пятроўская // Камуністычная праца. – 1980. – 31 мая.

**Касько, В. Д.** Удасканальванне бібліятэчнага абслугоўвання / В. Д. Касько // Камуністычная праца. – 1975. – 20 лютага.

**Бялова, М.** Людзі сярод кніг / Марыя Бялова // Камуністычная праца. – 1971. – 19 кастрычніка.

Аб рабоце Кобрынскай раённай бібліятэкі.

Кобрынскі раён

Кобрын

Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка

Мартынаў Аляксей Міхайлавіч

Бібліятэкі